# «ТРАДЫЦЫЙНАЯ КУЛЬТУРА І ПОБЫТ БЕЛАРУСАЎ»

***Пад такой назвай нядаўна ў выдавецтве «Беларуская энцыклапедыя» выйшла кніга, аўтарамі якой з'яўляюцца Кацярына Півавар, дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства нашага ўніверсітэта, і былы загадчык кафедры Генадзь Арцямёнак.***

«У лінгвістыцы існуе думка, што спеласць таго ці іншага мовазнаўчага напрамку вызначаецца выхадам слоўнікаў па выніках грунтоўных даследаванняў у дадзеным рэчышчы. Ідэя вывучаць мову ў кантэксце культуры, жыцця народа не новая і вельмі распаўсюджаная, што выклікала выхад цэлага шэрагу лінгвакраіназнаўчых і лінгвакультуралагічных слоўнікаў. Безумоўна, і беларусам неабходна мець падобныя лексікаграфічныя выданні», – расказала Кацярына Сяргееўна.




Навукоўцы працавалі над зборам і сістэматызацыяй матэрыялу больш за 5 гадоў.

«Генадзь Антонавіч зацвердзіў тэму навукова-даследчай працы кафедры беларускага мовазнаўства «Беларуская мова як крыніца лінгвакраіназнаўчай інфармацыі пра дзяржаўнасць, гісторыю і культуру беларускага народа» на 5 гадоў. Не працуючы ў штаце кафедры, я знаходзілася ў аўтарскім калектыве. І прызнаюся, што з захапленнем працавала над тэмай.

Генадзь Антонавіч быў таленавітым кіраўніком навукова-даследчага калектыву. Навуковец, валодаючы бліскучымі энцыклапедычнымі ведамі і грунтоўнай лінгвістычнай падрыхтоўкай, мог прадбачыць запатрабаванасць таго ці іншага даследавання ў беларускім мовазнаўстве, умеў зацікавіць, падтрымаць, даць карысную параду, што вельмі спрыяла плённай рабоце. Таксама ў сааўтарстве з ім мы апублікавалі шэраг артыкулаў, дзе прааналізавалі лексікаграфічныя набыткі лінгвакраіназнаўства, акрэслілі важнасць слоўнікаў для выкладання беларускай мовы і ў міжкультурнай камунікацыі. Яго раптоўны сыход з жыцця ў красавіку гэтага года стаў непапраўнай стратай і для нашага калектыву, і для беларускай лінгвістыкі ўвогуле. Выдадзеная кніга — прыблізна трэць ад падрыхтаванага матэрыялу. Ёсць надзея, што грунтоўны лінгвістычны слоўнік яшчэ пабачыць свет», – адзначыла выкладчык.

Кніга адрасавана чытачам малодшага і сярэдняга школьнага ўросту, аднак будзе цікавай і карыснай і іншым. У ёй у займальнай форме падаюцца звесткі пра традыцыйны побыт беларусаў, свет беларускай прыроды, унікальныя адметнасці беларускай мовы і святочных традыцый – духоўнай спадчыны нашага народа.

Выданне выйшла тыражом 1500 экзэмпляраў і ў хуткім часе з'явіцца ў кніжных крамах нашай краіны. Прэзентацыя кнігі адбудзецца на факультэце гуманітарыстыкі і моўных камунікацый ВДУ.

**Алеся МЯДЗІЛЬ.**
**Фота аўтара.**

# ИНТЕРЕСНО И ПОЛЕЗНО

***Несмотря на то, что сегодня мы проводим большое количество времени в интернете, многим из нас по-прежнему нравится читать книги в бумажном варианте. Специально ко Дню библиотек я попросила преподавателей, сотрудников и студентов нашего университета рассказать о книгах, которые, на их взгляд, нужно прочесть каждому человеку.***

**Валентина КОЛОШКИНА, старший преподаватель кафедры физического воспитания и спорта:**

«К сожалению, наша молодежь совсем не читает сказок. А я очень люблю русские народные сказки. Ту же «Репку» или «Колобка». С их помощью можно научиться доброте, порядочности, любви. Поэтому подрастающему поколению я советую обязательно читать сказки».

**Татьяна СЛЕСАРЕВА, доцент кафедры общего и русского языкознания:**

«Как бы ни банально это звучало, но я бы посоветовала начать с основы основ – Библии. Еще рекомендую «Мастера и Маргариту» Михаила Булгакова. Если отойти от классики, то обратите внимание на Дину Рубину и Людмилу Улицкую. Их книги будут полезны всем, ведь в них поднимаются насущные, понятные каждому проблемы и предлагаются пути их решения.

Для отдыха и для настоящих филологов советую романы Маши Трауб или Дарьи Донцовой (исключительно в целях наблюдения за изменениями языка). С этой же целью можно прочитать произведения Андрея Белянина, особенно его серию «Тайный сыск царя Гороха»».

**Александра МЕДВЕДЕВА, студентка 1 курса художественно-графического факультета:**

«Рекомендую произведение «Поющие в терновнике» австралийской писательницы Колин Маккалоу. Книга понравится любителям романтического жанра, поскольку там показана довольно интересная и захватывающая история любви».

**Анна ОКСЕНЧУК, заведующий кафедрой литературы:**

«Книга «Дао Дэ Цзин» китайского философа Лао Цзы. Это очень древний текст, который во всех подробностях описывает, как человек может изменяться на протяжении жизни от семечка до сухого дерева. Ибо настоящий мудрец, по Лао Цзы, есть сухое дерево, то есть то, что незаметно ни для кого. Он абсолютно вписан в мир. Он так пустил в себя жизнь, что сам стал частью этой жизни. И чтобы достичь гармонии с миром или хотя бы стать на путь мудреца, нужно читать Лао Цзы».

**Людмила МИЦКЕВИЧ, ведущий библиотекарь общего читального зала:**

«Обязательно прочитайте «451 градус по Фаренгейту» Рея Брэдбери. Несмотря на то, что это фантастика и книга была написана в 1953 году, идеи и проблемы этого произведения звучат злободневно и в наше время. Например, описание ракушек в ушах некоторых героев очень похоже на описание современных беспроводных наушников. Или то, что люди в книге боятся живого общения и разговаривают через огромные телевизоры. Это, конечно, производит впечатление».

**Александра ДАНИЛЕНКО, студентка 2 курса ФГиЯК.**